*У.І. Рынкевіч,*
*прафесар кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ САТЫРЫЧНЫЯ АПОВЕДЫ АРТУРА БАРТЭЛЬСА

Імя і багатая творчая спадчына Артура Бартэльса (1818–1885) належаць культуры беларускага, польскага і літоўскага народаў. У Літве і Польшчы яго ведаюць больш як польскамоўнага пісьменніка, сатырыка, папулярнага аўтара–выканаўца жартоўных песенек. У меншай ступені вядомы яго ўнёсак у гісторыю мастацтва XIX ст. як рысавальшчыка-карыкатурыста.

А. Бартэльс нарадзіўся і пражыў большую частку жыцця на Міншчыне. Менавіта на радзіме ён стварыў асноўныя творы выяўленчага мастацтва: арыгінальныя малюнкі бытавога жанру, этнаграфічныя замалёўкі, малюнкі для альбомаў-аповедаў сатырычнага зместу. У творчую спадчыну Артура Бартэльса ўваходзяць таксама зборнікі вершаў, песень, празаічныя і драматургічныя творы, аналітычныя і папулярныя артыкулы ў польскіх часопісах, музычныя творы. Кнігі, часопісныя артыкулы, шматлікія накіды, ксілаграфічныя гравюры і літаграфічныя эстампы часткова захаваліся да сённяшняга дня ў архіўных сховішчах Парыжа, Лондана, Варшавы, Кракава, Вільнюса, Львова і іншых еўрапейскіх гарадоў. Але на Беларусі графічных твораў А. Бартэльса няма. Мастацтвазнаўчых даследаванняў яго творчасці таксама адзінкі [1; 4].

Найбольшую каштоўнасць з графічнай спадчыны А. Бартэльса маюць альбомы-аповеды, надрукаваныя літаграфічным спосабам. Кожны аркуш змяшчае рукапісны тэкст і графічныя выявы сатырычнага маралізатарскага характару. Не аднойчы ў даследчыкаў узнікала пытанне класіфікацыі альбомаў-аповедаў: аднесці іх да шчодра ілюстраваных літаратурных твораў або да зборніка літаграфічных эстампаў з аўтарскім тэкстам мастака? Пры гэтым вызначэнне жанру заўсёды было адназначным – сатырычны.

Яшчэ ў XVIII ст. малюнкі, карціны і гравюры, у якіх прафесійныя графікі высмейвалі норавы еўрапейскага грамадства, паклалі пачатак сістэматычнаму развіццю карыкатуры як важнай галіны выяўленчага мастацтва (У. Хогарт, Дж. Гілрэй, Т. Роўлендсан,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дж. Крукшанк і інш.). Небывалую сілу і глыбіню мастацкага ўздзеяння карыкатура набыла ў XIX ст. у сатырычных працах Ф. Гоі, О. Малье, Ж.Пілацеля і інш. Афіцыйнае прызнанне мела вострая карыкатура на прыгоннікаў мастака польскага паходжання Аляксандра Арлоўскага, якога гісторыкі лічаць пачынальнікам карыкатурнага жанру ў рускім мастацтве. Менавіта яго разуменне сатырычнага малюнка і тэхніка працы пяром былі найбольш блізкія А. Бартэльсу.

Як заўзяты рысавальшчык, А. Бартэльс працаваў паўсюль, дзе бываў, і пакінуў пасля сябе шмат жанравых, гумарыстычных і этнаграфічных малюнкаў. Пры ўсёй разнастайнасці цікавых яму тэм героямі яго мастацкіх твораў часцей станавіліся тыпажы з народу, што добра ілюструюць малюнкі А.Бартэльса, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага музея ў Кракаве: «Жабрак», «Постаць старога», «Мужчына ў кафтане», «Накіды асоб з вышэйшага свету», «Шляхціц з келіхам», «Стары з кіем». Галоўнай і абавязковай ўмовай у адборы персанажаў для сваіх малюнкаў ён лічыў выразнасць вобразу-тыпу, адлюстравання ў ім характэрных рыс шматаблічнага грамадскага жыцця.

Развіццё карыкатуры было цесна звязана з літаратурнай публіцыстыкай. Салідныя часопісы (расійскія «Сын Отечества», «Ералаш») мелі асобныя раздзелы гумару і сатыры. Малюнкі А. Бартэльса друкаваліся ў папулярных польскіх перыядычных выданнях: «Tygodnik ilustrawany», «Kłosy». Гравюры з малюнкаў А. Бартэльса годна глядзяцца побач з работамі польскіх мастакоў Ф. Кастржыцкага і Ю. Косака – прызнаных майстроў дынамічных вострахарактарных замалёвак сацыяльнага зместу. Трэба зазначыць, што аматарскія малюнкі А. Бартэльса, атрымаўшы належную апрацоўку ў выдавецкіх майстэрнях, набывалі большую вобразную выразнасць. Гэта пацвярджаецца параўнаннем дрэварытаў паводле малюнкаў А. Бартэльса да артыкула «Карціны грамадзянскага становішча на Літве» з іх арыгіналамі («Камісар», «На ганку», «Арандатар», «Нарачны»).

Вострай сатырай на норавы свайго часу з'яўляюцца арыгінальныя малюнкі А. Бартэльса з рукапісных альбомаў: «Скнара», «Чалавек высокага паходжання», «Суседскі абедзік», «Эканом». Тры з апошніх захоўваюцца ў навуковай бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта. На кожным альбомным аркушы змешчана па некалькі малюнкаў, аб'яднаных немудрагелістым сюжэтам, падгледжаным у штодзённасці: жыццёвы шлях арыстакрата «ад нараджэння да скону», суседская пагулянка ў абяднелага шляхціца, звычкі «самага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокаарганізаванага з млекакормячых» і да т.п. Малюнкі з серыі «Аблягчэнне пашпарта за граніцай» высока цаніў і меў у сваёй калекцыі Юзаф Крашэўскі – польскі пісьменнік, гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч, мастак і калекцыянер.

Сапраўды шырокую вядомасць творчасць А.Бартэльса атрымала дзякуючы тром друкаваным серыям малюнкаў: «Пан Скарупа», «Лапігрош», «Пан Яўгеніуш». Яны былі выдадзены літаграфічным спосабам (наклад Я. Вільчынскага) у «Віленскім альбоме» ў парыжскай майстэрні Р. Лемэрс’ера. У прадмове да «Лапігроша» выдавец піша, што А. Бартэльс першы з польскіх рысавальшчыкаў асмеліўся прадставіць свет «так, як яго разумеў». Яго малюнкі не з'яўляюцца ні пасквілем, ні палітычнай сатырай, яны «выяўляюць людскія заганы, якія шырока распаўсюджаны ў грамадскім жыцці…» [2, с. 3].

Сюжэты развіваюцца па храналагічным прынцыпе літаратурнага аповеду аб жыцці героя: знаёмства з персанажам, службовыя і хатнія справы, зносіны з суседзямі і да т.п. Альбомы, блізкія па сюжэтна-жанравай канцэпцыі, розняцца стылістыкай выканання малюнкаў. Ілюстрацыі «Пана Скарупы» падаюцца дэталёва прамаляванымі, а «Лапігрош» перанасычаны дробнымі дэталямі, затое малюнкі «Пана Яўгеніуша» вызначаюцца шырокай, энергічнай штрыхавой манерай, якая сведчыць аб даволі ўпэўненым рысавальным майстэрстве аўтара. Рознасць выканальніцкіх манер выклікае пытанне: ці адной рукі літаграфіі?

Звернемся да некаторых эпізодаў стварэння альбомаў. Арыгінальныя малюнкі і тэкст да «Лапігроша» былі зроблены ў 1845 г. У жніўні 1857 г. Я. Вільчынскі звярнуўся да добра вядомага А. Бартэльсу па Варшаўскай гімназіі мастаку Ц. Норвіду, які на той час жыў у Парыжы, з прапановай выканаць у літаграфіі серыю сатырычных малюнкаў А. Бартэльса. Перамовы ішлі доўга і цяжка, пры тым што паразуменне па асігнаванні выдання было знойдзена адразу. Праблема зводзілася да таго, што, на думку Ц.Норвіда, калі гэта літаратурны твор, дык для яго ілюстравання не вельмі падыходзіць выкарыстанне малюнкаў самога пісьменніка, асабліва «калі тыя не належаць да лепшых узораў». Праз пэўны час Я.Вільчынскаму ўдалося пераканаць яго, але, ведаючы натуру Ц.Норвіда, гісторыкі мастацтва мелі падставы меркаваць, што ў арыгіналы А.Бартэльса была ўнесена істотная карэкцыя [3, с. 27]. Тым не менш альбом усё ж такі выйшаў у свет ў 1858 г. і меў вялікі поспех.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выразныя востра-сацыяльныя характарыстыкі грамадства свайго часу дае мастак праз вобраз памешчыка ў альбоме «Лапігрош». Аркушы маюць трапныя назвы: «Саноўнік Лапігрош», «Навуковыя даследаванні Лапігроша», «Філантропія Лапігроша», «Асаблівыя прыхільнасці Лапігрошаў», «Забавы Лапігроша» і інш. Звяртае на сябе ўвагу геаграфічнае месца, дзе разгортваюцца падзеі аповеду. Яно дакладна вызначана ў аркушы «Навуковыя пазнанні Лапігроша». Тут намалявана геаграфічная карта, у цэнтры якой – Смаргонь. Невялікае беларускае мястэчка вылучана як галоўны горад Сусвету. Укруг яго меншымі літарамі пазначаны назвы іншых населеных пунктаў: Мінск, Вільня, Брэст і іншыя гарады, дзе наўрад ці бываў Лапігрош, але аб якіх ён чуў. Як выказаўся аб сатырычных літаграфіях мастак Д. Кандратовіч: «Лапігрош» хвалюе свежым, трапным поглядам… угледзеўшыся ў кожную з тых фігурак на гравюрах, успамінаецца нам нехта знаёмы альбо той, каго недзе ўжо бачылі» [4, с. 67].

Артур Бартэльс застаўся ў гісторыі беларускай культуры як featured разнабаковы таленавіты творца. У выяўленчым мастацтве ён праявіў сябе як самабытны мастак-аматар сатырычнага жанру. Яго графічная творчасць насіла яўна выражаны сацыяльна-бытавы характар, яна адлюстроўвае жыццё і побыт розных сацыяльных слаёў беларусаў, літоўцаў, рускіх – насельнікаў Беларусі XIX ст. і мае не толькі мастацкую каштоўнасць, але і этнаграфічную, гістарычную. Вяртанне імя Артура Бартэльса на Радзіму хаця б у выглядзе факсімільных рэпрадукцый яго твораў – пачэсная справа і абавязак беларускага мастацтвазнаўства.


1. *Рынкевіч, У.* Артур Бартэльс: талент пісьменніка і мастака / У. Рынкевіч, В. Рыхлова // Роднае слова. – 2003. – № 7. – С. 82–97.

2. *Album Wileńskie.* Oddzial 6, № 5. Imp. Lemercier Paris. (A.Bartels. Szkice obyczajowe. «Lapigrosz»).

3. *Suchodolska, M.* Rysunki z kolekcji J.I.Kraszewskiego w Muzeum Narodowym w Warszawe / M. Suchodolska, I. Jakimowicz, J. Jaworska. – Warszawa, 1961.

4. *Widocka, H.* Nieznany Horwid / H. Widocka. – Warszawa, 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ